УДК 372.8821.6

І.М. ЛЯВОНЕНКА

# ЛІТАРАТУРНАЯ ГУЛЬНЯ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ ВУЧНЯЎ

Школьная літаратурная адукацыя на працягу многіх дзесяцігоддзяў застаецца ў цэнтры грамадскай увагі, з'яўляючыся прадметам для навуковых дыскусій. Як правіла, большасць праблем, што ўздымаюцца ў час правядзення гэтых дыскусій, звязана з павышэннем ролі ўрокаў літаратуры ў фарміраванні вучняў як творчых, надзеленых жывым уяўленнем, актыўных чытачоў.

Бясспрэчна, што літаратура – мастацкая творчасць, і вывучэнне яе павінна быць творчым, задавальняць пазнавальную актыўнасць вучняў, уключаць іх у самастойную творчую дзейнасць. Прынцып творчага навучання дазваляе актуалізаваць формы і метады, інтэсіфікаваць педагагічны працэс, зрабіць яго маральна-эстэтычным, змястоўным і выніковым, пераўтварыць яго ў адзіную сістэму сумеснай творчай дзейнасці настаўнікаў і вучняў [2]. У гэтых адносінах літаратурная гульня, па-першае, магла б плённа паўплываць на педагагічны працэс, а па-другое, яна здольна ўнесці рознабаковасць ва ўрок, мабілізуючы ўсе здольнасці дзіцяці і абуджаючы ў вучняў асабістую зацікаўленасць у тым, што ім належыць зрабіць на шляху раскрыцця сваіх творчых задаткаў.

Паводзіны вучня ў гульні, які зацікаўлена разважае і актыўна ставіцца да ўсяго ва ўмовах, што ствараюцца чалавечай фантазіяй, падобны на паводзіны думаючага чытача. Гэтае характэрнае для дзяцей гульнёвае самаадчуванне аднойчы ствараецца, а потым развіваецца і ўрэшце захоўваецца на працягу ўсяго свядомага жыцця. У сталым узросце чалавек час ад часу ўзнаўляе ў памяці гульні, якія дапамагаюць хоць бы часткова захаваць дзіцячую непасрэднасць, якая праяўляецца ў наіўным поглядзе на свет і навізне ўспрымання жыцця.

Літаратурная гульня здольна аб'яднаць у сабе чытацкія назіранні, разважанні над тэкстам, выразнае чытанне, славеснае маляванне і іншыя прыёмы развіцця вобразнага ўяўлення. Расійскі псіхолаг Л.С.Выготскі справядліва сцвярджаў: "Дзіцячая творчасць знаходзіцца ў тых жа адносінах з творчасцю дарослых, у якіх і дзіцячая гульня з жыццём. Гульня неабходна дзіцяці так, як і літаратурная творчасць неабходна перш за ўсё для правільнага разгортвання сіл самога аўтара... Як мы дапамагаем дзецям арганізоўваць іх гульні, выбіраем і накіроўваем іх гульнёвую дзейнасць, так мы зможам стымуляваць і накіроўваць творчую рэакцыю дзяцей" [1]. Вось чаму гульня можа стаць дзейсным сродкам мастацкай інтэрпрэтацыі твора, прыёмам вучнёўскага літаратурнага даследавання, і творчым вынікам вывучэння таго ці іншага твора.

Гульню трэба разглядаць не толькі як забаву, а як перспектыўны сродак літаратурнай адукацыі ў школе. Па гэтай прычыне актуальным на сённяшні

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

дзень застаецца пытанне распрацоўкі адпаведных гульняў, арганічна звязаных з усімі аспектамі выкладання літаратуры. Стварэнне тэорыі, класіфікацыі гульняў, іх сістэм на базе выкладання літаратуры можа з'явіцца асновай для развіцця і далейшага ўкаранення гульнёвай методыкі ў іншых школьных прадметах, галоўным чынам гуманітарнага і эстэтычнага цыклаў.

Маючы цесную сувязь з мастацтвам і асабліва з мастацтвам слова і з'яўляючыся арганічнай сферай дзейнасці для школьнікаў, гульня ўздзейнічае на абуджэнне і развіццё творчай актыўнасці вучняў, фарміруе чытацкую назіральнасць, уплывае на развіццё псіхічных працэсаў, неабходных для адэкватнага ўспрыняцця твора (уяўленне, здольнасць да суперажывання, вобразная памяць, адчуванне паэтычнага слова), уключае вучняў у разнапланавую мастацкую дзейнасць. Літаратурная гульня станоўча ўплывае на эмацыянальную атмасферу ўрока: зацікаўленасць агульнымі перажываннямі стварае ўмовы для супрацоўніцтва і для вырашэння вучэбных задач.

Такім чынам, найважнейшай умовай уздзеяння гульні на абуджэнне і развіццё пазнавальна-творчай актыўнасці вучняў з'яўляецца яе пераўтварэнне з эпізода на ўроку ў незалежны аспект выкладання, цесна звязаны з тэарэтычным засваеннем літаратурных паняццяў і навуковым падыходам да развіцця мовы вучняў.

## *ЛІТАРАТУРА*

1. ***Выготский Л.С.*** Воображение и творчество в детском возрасте. – Санкт-Петербург, 1997. – С. 56.
2. Канцэпцыя рэфармавання літаратурнай адукацыі / Пад рэд. ***М.А.Лазарука, В.У.Івашына.*** – Мн., 1996. – С.9.